**Арсяновіч, Дар'я Уладзіміраўна. Да стагоддзя Аляксея Нічыпаравіча Карпюка [Электронны рэсурс] / Арсяновіч, Дар'я Уладзіміраўна, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаўнага архіва грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці // Архівы Беларусі: сайт. – Рэжым доступу:** https://www.facebook.com/archivesbelarus/posts/774769643052482. – Дата доступу: 10.04.2020.

# Да стагоддзя Аляксея Нічыпаравіча Карпюка

14 красавіка 2020 года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння Карпюка Аляксея Нічыпаравіча – славутага пісьменніка, класіка беларускай літаратуры, аўтара вельмі шчырых і рэалістычных твораў пра Заходнюю Беларусь. Ягоны лёс, як і лёс, напэўна, большасці творчых асоб, цяжка назваць лёгкім. Амаль усё свядомае жыццё Аляксея Нічыпаравіча прайшло ў барацьбе: з нямецкімі акупантамі падчас Вялікай Айчыннай вайны, з паклёпам і недаверам у пасляваенны час. Але ж нягледзячы на ўсе складанасці і пасткі лёсу, пісьменнік захаваў галоўнае – уласную асобу, а разам з ёй – прагу да справядлівасці і любоў да Беларусі.

Горад Гродна, дзе Карпюк правёў значную частку жыцця, можа сапраўды ганарыцца той спадчынай, якую Аляксей Нічыпаравіч пакінуў для нашчадкаў. Менавіта тут былі напісаны амаль усе самыя вядомыя творы – аповесці «Данута» (1960), «Пушчанская адысея» (1964), «Сучасны канфлікт» (1985), раман «Вершалінскі рай» (1974), зборнікі апавяданняў «Дзве сасны» (1958), «Партрэт» (1983), кнігі нарысаў «Мая Гродзеншчына» (1960), «След на зямлі: скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны» (1972). У Гродна пісьменнік плённа займаўся спачатку педагагічнай і журналісцкай, потым – літаратурнай, публіцыстычнай і грамадскай дзейнасцю, быў сакратаром Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Але на гэтым роля Карпюка ў гродзенскай прасторы не скончваецца.

У фондзе № 1 «Гродзенскі абкам КПБ» дзяржаўнага архіва грамадскіх аб’яднанняў Гродзенскай вобласці ўтрымліваецца дастаткова цікавы дакумент. Гэта ліст Аляксея Нічыпаравіча Карпюка ў сакратарыят ЦК КПБ, датаваны студзенем 1956 года. Тэкст ліста прадстаўлены ніжэй.

Цікава, што на такі досыць смелы і рашучы крок пісьменніка ў даволі хуткім часе з боку партыйных уладаў быў дадзены адказ у выглядзе паступовага выкання ўзгаданных у лісце прапаноў. Так, у пратаколе № 41 пасяджэння бюро Гродзенскага абкама КПБ ад 31 студзеня 1957 года сярод іншых пастаноў значыцца:

«Идя навстречу пожеланиям трудящихся, общественным организациям и отмечая большие заслуги в развитии белорусской культуры, а также учитывая, что академик Карский Е.Ф. и поэтесса Пашкевич (Тетка) А.С. родились и значительное время своей жизни провели на Гродненщине,

бюро обкома КПБ и исполком облсовета депутатов трудящихся постановляют:

1. По увековечиванию памяти академика Карского Е.Ф.:
а) присвоить Гродненской областной библиотеке имя академика Карского Е.Ф.;
б) присвоить имя Карского Е.Ф. Лашанской средней школе Гродненского района и установить на ней мемориальную доску.

2. По увековечиванию памяти Пашкевич (Тетки) А.С.:
а) присвоить Гродненскому культпросветучилищу имя А.С.Пашкевич (Тетки);
б) назвать именем А.С.Пашкевич (Тетки) среднюю школу в пос. Острино и установить бюст Тетки».

А вось што знаходзім у пратаколе № 27 пасяджэння бюро Гродзенскага гаркама КПБ ад 23 верасня 1958 года:

«В целях увековечивания памяти выдающейся польской демократической писательницы Э.Ожешко, бюро горкома КПБ постановляет:

1. Открыть в доме, в котором проживала Э.Ожешко, читалный зал её имени (филиал областной библиотеки).
2. Обязать исполком городского Совета депутатов трудящихся освободить две комнаты под читальный зал».

Дарэчы, неўзабаве ў доме пісьменніцы адкрыўся і паўнавартасны музей.

Але на гэтым справа не скончылася. Так, ў 1958 годзе ў Свіслачы з'явіўся помнік Кастусю Каліноўскаму аўтарства славутага Заіра Азгура, а 30 кастрычніка 1987 года рашэннем Савета Міністраў БССР Свіслацкай сярэдней школе № 1 (з 2005 года – гімназіі № 1) было прысвоена імя Кастуся Каліноўскага. У Гродна ў 1986 годзе адкрыўся дом-музей Максіма Багдановіча, а ў суседнем Жалудку ў недалёкім 2011 годзе паўстаў помнік Валерыю Ўрублеўскаму. Што казаць пра вуліцы, назвы якіх сталі такімі звыклымі для большасці гродзенцаў: Ажэшкі, Каліноўскага, Цеткі, Карскага, Урублеўскага, Багдановіча.

Вельмі важна, што справа, распачатая Карпюком, жыве, як жыве і імя Аляксея Нічыпаравіча. Дзякуючы намаганням неабыякавых гродзенцаў адна з вуліц горада ў 2018 годзе атрымала назву ў гонар славутага пісьменніка, а ў наступным 2019 годзе была ўрачыста адкрыта шыльда ў доме, дзе Карпюк жыў працяглы час.

Было б вельмі добра працягнуць шэраг такіх гучных падзей і ў 2020, каб запомніць гэты год, перш за ўсё, з нагоды 100-гадовага юбілея выдатнага пісьменніка Аляксея Нічыпаравіча Карпюка.

САКРАТАРУ ЦК КПБ тав. ГАРБУНОВУ 1

ад намесніка старшыні Гродзенскага літаратурнага абласнога аб"еднання КРПЮКА А.Н.

ПАВАЖАНЫ ЦІМАФЕЙ САЗОНАВІЧ!

Да апошняга часу ў нас на Гродзеншчыне не ўшанавана памяць выдатных дзеячоў беларускай культуры: КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА, ЭЛАІЗЫ ПАШКЕВІЧ ЦЁТКІ , БАГДАНОВІЧА, КАРСКАГА і іншых. Як гэта не дзіўна, але-ж нават такому выдатнаму нацыянальнаму герою, як КАЛІНОЎСКАМУ, якога добра ведае ўвесь СССР, на яго радзіме ў Свіслачы няма нават мемарыяльнай дошкі. На магіле ЦЁТКІ стаіць крыж, які паставіла ЭЛАІЗЕ сястра. Вуліца у Гродне, на якой жыў БАГДАНОВІЧ, і сёння называецца... Агароднай, на ёй нічога не напамінае, што тут калісьці правёў частку свайго жыцця паэт. Вялікі савецкі вучоны КАРСКІ нарадзіўся ў вёсцы Лаша пад Гродна. Памяць аб ім таксама не ўшанавана.

Прыведзеныя мной факты выклікаюць у некаторай часткі мясцовай беспартыйнай інтэлігенцыі розныя крыватолкі, не зусім здаровыя гутаркі аб мнімым ігнараванні беларускай культуры на што я, як камуніст, лічу сваім абавязкам звярнуць Вашую ўвагу.

Каб пакласці канец усялякім гутаркам, а таксама, каб выказаць належнае выдатным людзям нашага народа, на маю думку першым чынам трэба зрабіць наступнае:

А. Па ўвекавечыванню памяці Каліноўскага:

1. Прысвоіць Гродзенскаму педагагічнаму інстытуту імя Каліноўскага (ка дню 16 лютага, калі Каліноўскі быў павешаны).

2. Свіслачскую сярэднюю школу назваць іменем К. Каліноўскага.

3. На месцы былой гімназіі, дзе вучыўся Каліноўскі, устанавіць мемарыяльную дошку.

4. Цэнтральную вуліцу ў Свіслачы назваць іменем Каліноўскага.

Б. Па Пашкевіч:

1. Васілішкаўскай сярэдняй школе прысвоіць імя Цёткі.

2. Іменем Цёткі назваць адну вуліцу ў Гродне.

3. Імя Цёткі прысвоіць Гродзенскаму кульпрасвет.вучылішчу.

В. Па Багдановічу:

I. Вуліцу Агародную ў Гродне назваць вуліцай Багдановіча.

2. Імя Багдановіча прысвоіць Гродзенскай бел. Сярэдняй школе нумар 4.

Г. Па Карскаму:

I. Гродзенскай абласной бібліятэцы прысвоіць імя акадэміка Карскага.

2. Адну вуліцу ў Гродне назваць іменем Карскага.

3. У вёсцы Лаша прысвоіць імя Карскага сельскай школе і павесціць на ёй мемарыяльную дошку.

Усе гэтыя мерапрыемствы амаль не патрабуюць якіх-небудзь матэрыяльных сродкаў. І ўсё гэта можна зрабіць літаральна за тыдзень.

Таксама трэба прадбачыць пабудаванне помнікаў Каліноўскаму, Цёткі, і бюстаў Карскаму і Багдановічу. Але для гэтага трэба ўжо вылучаць спецыяльную камісію. Гэта будзе другім этапам мерапрыемстваў.

Па прычыне ўсілення эканамічных і культурных сувязей з Польскай Дэмакратычнай Рэспублікай трэба падумаць і аб аднаўленні музея ў доме Элізы Ажэшка ў Гродне, які зараз, між іншым, пустуе. Таксама трэба ўстанавіць мемарыяльную дошку ў Жалудоцкім раёне на радзіме выдатнага рэвалюцыянера, Генерала Парыжскай Комуны, члена І Інтэрнацыянала ВАЛЕРЫЯ ВРУБЛЕЎСКАГА, аб якім так цёпла адзываўся Ленін.

А. КАРПЮК

адрас: г. ГРОДНА, вул. Сацыялістычная 10, кв. 3

9-I-1956 г.

3. Імя Цёткі прысвоіць Гродзенскаму культпрасвет.вучылішчу.

В. Па Багдановічу:

I. Вуліцу Агародную ў Гродне назваць вуліцай Багдановіча.

2. Імя Багдановіча прысвоіць Гродзенскай бел. Сярэдняй школе нумар 4.

Г. Па Карскаму:

I. Гродзенскай абласной бібліятэцы прысвоіць імя акадэміка Карскага.

2. Адну вуліцу ў Гродне назваць іменем Карскага.

3. У вёсцы Лаша прысвоіць імя Карскага сельскай школе і памясціць на ёй мемарыяльную дошку.

Усе гэтыя мерапрыемствы амаль не патрабуюць якіх-небудзь матэрыяльных сродкаў. І ўсё гэта можна зрабіць літэральна за тыдзень.

Таксама трэба прадбачыць пабудаванне помнікаў Каліноўскаму, Цётцы, і бюстаў Карскаму і Багдановічу. Але для гэтага трэба ўжо вылучаць спецыяльную камісію. Гэта будзе другім этапам мерапрыемстваў.

Па прычыне ўсілення эканамічных і культурных сувязей з Польскай Дэмакратычнай Рэспублікай трэба падумаць і аб аднаўленні музея ў доме Элізы Ажэшка ў Гродне, які зараз, між іншым, пустуе. Таксама трэба ўстанавіць мемарыяльную дошку ў Жалудоцкім раёне на радзіме выдатнага рэвалюцыянера, Генерала Парыжскай Комуны, члена І Інтэрнацыянала ВАЛЕРЫЯ ВРУБЛЕЎСКАГА, аб якім так цёпла адзываўся Ленін.

А. КАРПЮК

адрыс: г. ГРОДНА, вул. Соцыялістычная IO, кв. 3

9-І-1956

САКРАТАРУ ЦК КПБ тав. ГАРБУНОВУ 1

ад намесніка старшыні Гродзенскага літаратурнага абласнога аб"еднання КРПЮКА А.Н.

ПАВАЖАНЫ ЦІМАФЕЙ САЗОНАВІЧ!

Да апошняга часу ў нас на Гродзеншчыне не ўшанавана памяць выдатных дзеячоў беларускай культуры: КАСТУСЯ КАЛІНОЎСКАГА, ЭЛАІЗЫ ПАШКЕВІЧ ЦЁТКІ , БАГДАНОВІЧА, КАРСКАГА і іншых. Як гэта не дзіўна, але-ж нават такому выдатнаму нацыянальнаму герою, як КАЛІНОЎСКАМУ, якога добра ведае ўвесь СССР, на яго радзіме ў Свіслачы няма нават мамарыяльнай дошкі. На магіле ЦЁТКІ стаіць крыж, які паставіла ЭЛАІЗЕ сястра. Вуліца у Гродне, на якой жыў БАГДАНОВІЧ, і сёння называецца... Агароднай, на ёй нічога не напамінае, што тут калісьці правёў частку свайго жыцця паэт. Вялікі совецкі вучоны КАРСКІ нарадзіўся ў вёсцы Лаша пад Гродна. Памяць аб ім таксама не ўшанавана.

Прыведзеныя мной факты вызываюць у некаторай часткі мясцовай беспартыйнай інтэлігенцыі розныя криватолкі, не зусім здаровыя гутаркі аб мнімым ігнараванні беларускай культуры на што я, як камуніст, лічу сваім абавязкам звярнуць Вашую ўвагу.

Каб пакласці канец усялякім гутаркам, а таксама, каб выказаць належнае выдатным людзям нашага народа, на маю думку першым чынам трэба зрабіць наступнае:

А. Па ўвекавечыванню памяці Каліноўскага:

1. Прысвоіць Гродзенскаму педагагічнаму інстытуту імя Каліноўскага (ка дню 16 лютага, калі Каліноўскі быў павешаны) .

2. Свіслачскую сярэднюю школу назваць іменем К. Каліноўскага.

3. На месцы былой гімназіі, дзе вучыўся Каліноўскі, устанавіць мемарыяльную дошку.

4. Цэнтральную вуліцу ў Свіслачы назваць іменем Каліноўскага.

Б. Па Пашкевіч:

1. Васілішкаўскай сярэдняй школе прысвоіць імя Цёткі.

2. Іменем Цёткі назваць адну вуліцу ў Гродне.